**А. Стуб прызнаў, што выбары былі не свабоднымі**

**Фінькевіча зьнялі з пасады віцэ-старшыні «Маладога Фронту»**

**Жалобнае шэсьце на Дзяды**

**Фінансавы крызыс распаўсюджваецца на Беларусь**

**Штык-абэліск Берасьцейскай крэпасьці адновяць**

На мінулым тыдні варта адзначыць тры падзеі ў Беларусі, па якіх магчыма меркаваць пра яе сярэднетэрміновыя пэрспэктывы: візыты Пуціна і дзейснага старшыні АБСЭ ў Менск, а таксама выступ Лукашэнкі ў КДБ Беларусі.

Візыт Пуціна ў Менск і сустрэчы, якія адбыліся ў яго з Лукашэнкам і прэм'ерам Сідорскім, сталі важным этапам у беларуска-расейскіх дачыненьнях, асабліва ў галіне вайсковага супрацоўніцтва. Шэраг назіральнікаў лічыць, што ўзмацненьне вайсковай прысутнасьці Расеі на тэрыторыі Беларусі – гэта толькі пытаньне часу. І яно будзе адказам ня толькі на разьмяшчэньне амэрыканскіх элемэнтаў



photo.bymedia.net

## БЛОГ

Andrei Liakhovich, Miensk, Belarus

### Аб'ём эканамічнай падтрымкі Расеі – пытаньне адкладзенае

6 кастрычніка ў Менску адбыліся сустрэчы Лукашэнкі і прэм'ер-міністра С. Сідорскага з прэм'ер-міністрам Расеі Уладзімерам Пуціным. Беларускі бок прапанаваў Расеі ўсталяваць адпаведнымі пагадненьнямі аб'ём расейскай эканамічнай падтрымкі на 2009 г.

Заявы С. Сідорскага і чальцоў ураду сьведчаць, што ў Менску былі ўпэўненыя: Расея пагодзіцца на прапанаваную Беларусьсю цану на газ у 2009 г. (140 даляраў за тысячу кубамэтраў) і на наданьне льготнага крэдыту ў памеры 2 млрд. даляраў. Улады разьлічвалі, што Расея ня будзе гандлявацца, улічваючы ролю Беларусі на тле асноўных супярэчнасьцяў у адносінах Расеі з Захадам (разгортваньне ў Польшчы і Чэхіі аб'ектаў супрацьракетнай абароны ЗША і пэрспэктыва інтэграцыі ў НАТА Грузіі і Украіны).

Тым ня менш адзіным вынікам сустрэчаў у Менску стала зацьверджаньне бюджэту «саюзнага праекту» – беларуска-расейскага мастацкага фільму «Брэсцкая крэпасьць» (пра подзьвігі савецкіх памежнікаў у гады

другой усясьветнай вайны). Тым самым Масква сказала Лукашэнку, што аб'ём расейскай эканамічнай падтрымкі будзе вызначаны ў залежнасьці ад вынікаў дыялёгу Беларусі з Захадам.

Візыт Пуціна меў для Расеі перш за ўсё ўнутрыпалітычнае значэньне. Крэмль хацеў прадэманстраваць расейскаму электарату, што захоўвае падтрымку беларускага саюзьніка. Рэжым Лукашэнкі будзе выконваць ролю «фарпосту» і «шчыта» Расеі на заходнім кірунку.

Заява Лукашэнкі: «Хто-ніхто намякае, што мы пачынаем гандляваца: Расея… Захад… Я хачу сказаць: сяброўствам з рускімі не гандлююць!», было добрым пачаткам чарговага гандлю Менску і Масквы.

Лукашэнка палічыў патрэбным указаць Расеі на свой галоўны козыр у перамовах зь ёй – верагоднасьць зьмены характару адносінаў з Захадам. Ён таксама ўказаў Пуціну, якія наступствы будуць, калі Расея прапануе нізкую цану за выкананьне ролі саюзьніка. Паводле ягоных словаў, да канца году варта «правесьці рэвізію дасягнутых раней дамоўленасьцяў». У студзені 2007 г. ён ужо заяўляў, што Расея не выконвае ўзятыя на сябе саюзьніцкія абавязальніцтвы і злоўжывае альтруізмам Беларусі.

супрацьракетнай абароны, але і на пляны НАТА па стварэньні сілаў хуткага рэагаваньня. Пазьней, выступаючы ў чэкісцкім ведамстве, Лукашэнка заявіў, што «разьмяшчэньне сілаў хуткага рэагаваньня ў суседняй краіне для нас больш небясьпечна, чым разьмяшчэньне элемэнтаў супрацьракетнай абароны ў Чэхіі і Польшчы».

На паседжаньні ўраду Саюзнай дзяржавы, якое адбылося падчас знаходжаньня Пуціна ў Менску, стан няпэўнасьці ў беларускага боку выклікалі словы Пуціна, які прапанаваў саюзьнікам стварыць адмысловы валютны пул, неабходны для выкарыстаньня расейскага рубля замест даляра ва ўзаемаразьліках. Падобна, папярэдне беларускі бок ня быў пра гэта інфармаваны. Пры гэтым, падкрэсьліў Пуцін, не адмяняецца «гістарычная пэрспэктыва» расейскага рубля як адзінай валюты саюзнай дзяржавы. Відавочна, што Пуцін ідэю пулу разглядае толькі як часовы «мост» да пераходу на адзіную валюту. Камэнтароў афіцыйных асобаў зь беларускага боку наконт пуцінскага пулу пакуль не чуваць. «Гістарычная пэрспэктыва» пазбавіцца нацыянальнай валюты як атрыбуту сваёй незалежнасьці кіраўніцтву Беларусі не імпануе.



Галоўных вынікаў ад размоваў Пуціна ў Менску чакалі ў пытаньнях цаны на газ на 2009 год і даваньні Беларусі крэдыту ў памеры 2 млрд. даляраў. Пра газ нічога так і не было сказана публічна. Паказальна, што галоўны вядоўца перамоваў па газе, першы віцэ-прэм'ер Уладзімер Сямашка падчас візыту Пуціна ў Менск знаходзіўся ў Кіеве, на двухбаковым бізнэс-форуме. Паводле некаторых дадзеных, першы віцэ-прэм'ер правёў там сэрыю вельмі важных сустрэчаў, закліканых надаць новыя пэрспэктывы супрацоўніцтву Беларусі з Украінай. Такая сінхранізацыя з прыездам Пуціна ў Менск інтрыгуе. Што тычыцца пытаньня па вылучэньні крэдыту, то, паводле прызнаньня міністра фінансаў Беларусі, тэрміны даваньня крэдыту і крэдытная стаўка пакуль ня вызначаныя.

Візыт Пуціна зноў пацьвердзіў меркаваньне многіх экспэртаў, што пажаданыя кошты на энергарэсурсы ў абмен на задавальненьне геапалітычных амбіцыяў Масквы – стратэгічны вэктар палітыкі рэжыму Лукашэнкі.

На сустрэчы зь дзейсным старшынём АБСЭ, міністрам замежных справаў Фінляндыі Аляксандрам Стубам, які прыехаў у Менск з адназначным візытам, Лукашэнка запэўніў міністра ў тым, што Беларусь гатовая на ўсё дзеля дачыненьняў з ЭЗ.

«Мы гатовыя з Эўразьвязам на любыя дачыненьні. Але просім аднаго – павагі да нашага сувэрэнітэту, незалежнасьці і нашых традыцыяў. Не патрабуйце ад нас таго, што мы сёньня ня можам зрабіць», – заявіў Лукашэнка. У візыце Стуба ён угледзеў «сыгнал», што Эўропе «ня трэба закрывацца» ад Беларусі.

Наконт ацэнкі нядаўніх парлямэнцкіх выбараў Лукашэнка сказаў міністру, што «было дзіўна, што АБСЭ абвінаваціла нас у тым, што выбары не адпавядалі стандартам АБСЭ». Паводле ягонага меркаваньня, «у прынцыпе, стандартаў па выбарах няма», але ён хацеў бы, каб «АБСЭ мела такія стандарты».

Наўрад ці кіраўнік МЗС Фінляндыі мог чакаць ад беларускага прэзыдэнта словаў пра тое, што перад яго ўрадам пастаўленая

задача пашырыць кантакты зь Фінляндыяй, «аж да пытаньняў супрацоўніцтва ў будаўніцтве атамнай электрастанцыі». Назіральнікі адзначаюць, што, рыхтуючыся да сустрэчы зь міністрам замежных спраў Фінляндыі, беларускія ўлады пайшлі на беспрэцэдэнтны крок насустрач гэтай краіне – пагадзіліся на продаж фінскай півоварні «Olvi» кантрольнага пакету акцыяў беларускага піўзаводу «Лідзкае піва».

Размовы Лукашэнкі і яго давераных чыноўнікаў пра неабходнасьць наладжваць адносіны з Захадам не маглі ня выклікаць неадназначныя пытаньні ў іншых чыноўнікаў – як у Менску, так і ў Маскве. Таму кіраўнік Беларусі вырашыў патлумачыць сваю пазыцыю, і трыбунай для гэтага ён абраў родны КДБ.

Падчас сустрэчы з кіраўніцтвам і супрацоўнікамі КДБ, іншых сілавых структураў Лукашэнка заявіў, што поствыбарчая сытуацыя ў Беларусі адкрывае новыя магчымасьці для канструктыўнага дыялёгу з Захадам. Аднак, паводле кіраўніка дзяржавы, «нельга самазаспакойвацца і цешыць сябе дасягнутым».

«Я хацеў паказаць асобным чыноўнікам, бізнэсоўцам, асобным «сьвядомым» (нацыянальна арыентаваным) грамадзянам, што нашыя адносіны з Захадам – гэта не адносіны Лукашэнкі з Захадам. Прычына гэтых адносінаў не ў Лукашэнку хаваецца», – сказаў прэзыдэнт. Паводле ягоных словаў, «сёньня ў беларускім грамадзтве значна паменшылася тых людзей, якія шчыра лічылі, што Эўропа нас з радасьцю чакае». Адным з новых выклікаў для сыстэмы нацыянальнай бясьпекі можа зрабіцца сусьветны фінансавы крызыс, дна якога, паводле словаў Лукашэнкі, «ня бачна».

«Магчыма, гэта закране і нас, магчыма, мы сутыкнемся з праблемамі экспарту. Наша задача ў чарговы раз утрымацца, нягледзячы ні на што, – заявіў Лукашэнка. – На гэтым будуць спрабаваць дэстабілізаваць становішча». Мяркуючы па ўсім, каб не дапусьціць дэстабілізацыі рэжыму, у КДБ створана новае падразьдзяленьне – апэратыўна-сытуацыйны цэнтар. Зь яго дзейнасьцю і азнаёміліся беларускага кіраўніка. Трэба меркаваць, гэтае новае падразьдзяленьне стане важным інструмэнтам у Лукашэнкі для яго дыялёгу з Эўропай.

ПАЛІТЫКА

## А. Стуб прызнаў, што выбары былі не свабоднымі

***Міністар замежных спраў Фінляндыі, дзейны старшыня АБСЭ Аляксандар Стуб на сустрэчы зь беларускімі апазыцыйнымі палітыкамі прызнаў, што парлямэнцкія выбары, якія прайшлі ў Беларусі, не адпавядаюць стандартам АБСЭ.***




Паводле слоў Анатоля Лябедзькі, А.Стуб прызнаў, што выбары былі не свабоднымі.

«Аднак пры гэтым ён падкрэсьліў, што палітыка супрацоўніцтва лепшая за палітыку ізаляцыі, і зазначыў, што Эўропе лепш шукаць кропкі супрацоўніцтва зь Беларусьсю, чым захоўваць палітыку ізаляцыі», – сказаў А. Лябедзька.

Паводле слоў палітыка, на сустрэчы былі абмеркаваныя пытаньні адмены санкцыяў з боку Эўрапейскага Зьвязу ў дачыненьні да беларускага кіраўніцтва.

АПАЗЫЦЫЯ

## Фінькевіча зьнялі з пасады віцэ-старшыні «Маладога Фронту»

***За дзеяньні, накіраваныя на дыскрэдытацыю «Маладога Фронту», і спробы раскалоць арганізацыю Сойм «Маладога Фронту» 20 галасамі пры 3-х супраць і 3-х, што ўстрымаліся, ухваліў рашэньне Управы МФ пра пазбаўленьне Артура Фінькевіча пасады намесьніка старшыні арганізацыі, паведамляе прэс-служба МФ.***




Дадзенае рашэньне было прынята пасьля таго, як Артур, папярэджаны строгаю вымоваю ад імя Сойму, працягваў ганебныя дзеяньні, якія парушаюць ня толькі статут і іншыя дакумэнты «Маладога Фронту», але і элемэнтарную чалавечую мараль.

Прычыну такога рашэньня тлумачыць намесьніца старшыні МФ Наста Палажанка: «Артур распачаў працу па стварэньні фіктыўнай арганізацыі «Моладзь за Беларусь».

Абвесьціць яе плянавалася 1 лістапада, пасьля правядзеньня маладафронтаўскага зьезду, прайграўшы які Артур меўся заявіць пра раскол «Маладога Фронту».

ГРАМАДЗТВА

## Жалобнае шэсьце на Дзяды

***Старшыня Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі і ягоны намесьнік Віктар Івашкевіч падалі заяўку на правядзеньне 2 лістапада традыцыйнага жалобнага шэсьця на Дзяды.***




photo.bymedia.net

20 гадоў таму пры канцы кастрычніка адбыліся першыя агульнанацыянальныя Дзяды, якія назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю. Тысячы людзей сабраліся тады каля Ўсходніх могілак, каб ушанаваць памяць продкаў.

Старшыня Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі падкрэсьліў, што гэтыя Дзяды не павінны нікога разьядноўваць, а наадварот, павінны аб'яднаць людзей. Ён распавёў пра перамовы са старшынём Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі БНФ Зянонам Пазьняком.

ЭКАНОМІКА

## Фінансавы крызыс распаўсюджваецца на Беларусь

***Золатавалютныя запасы Беларусі, разьлічаныя паводле стандартаў Міжнароднага валютнага фонду, за верасень скараціліся на 460 млн. даляраў. Паводле стану на 1 кастрычніка яны склалі 4120 млн. даляраў, паведамляе «Наша Ніва» са спасылкай на Нацыянальны банк Беларусі.***

Гэта першая статыстычная прыява таго, што сусьветны фінансавы крызыс здольны драматычным чынам закрануць Беларусь, у прыватнасьці, яе фінансавы сэктар.

Для параўнаньня, золатавалютныя рэзэрвы Расеі ў аб'ёме 556,069 млрд. даляраў у верасьні страцілі рэкордныя 4,4%, ці 25,569 млрд. даляраў – рэкорд ад 1997 году.

КУЛЬТУРА

## Штык-абэліск Берасьцейскай крэпасьці адновяць

***Пачаў рамантавацца адзін з найбольш адметных сучасных сымбаляў Берасьцейскай крэпасьці – штык-абэліск, што знаходзіцца на тэрыторыі мэмарыяльнага комплексу. Яго вышыня 104,5 м, важыць ён 120 тонаў.***

Рамонт гэтай канструкцыі насьпяваў даўно, праўда, усё неяк не хапала сродкаў, каб яго распачаць. Але, калі летась з-за працэсаў карозіі парушыліся ўмацаваньні аднаго з тытанавых лістоў на вышыні 70 м і яго стала разгойдваць ветрам, зацягваць з рамонтам стала ўжо небясьпечна. У чэрвені б.г. на капітальны рамонт штыка-абэліска з рэспубліканскага бюджэту было выдаткавана 2,2 млрд. руб. Займацца гэтай справай прызначана Берасьцейскай мантажнай управе ААТ «Прамтэхмантаж», якая павінна выканаць задачу да канца 2008 году. У свой час пры мантаваньні штыка ўсе работы па падрыхтоўцы вяліся на зямлі, і толькі заключны этап яго пад'ёму праводзіўся з выкарыстаньнем адмысловых мэханізмаў.

Як сьцьвярджаюць спэцыялісты, пасьля рамонту абноўлены штык пратрымаецца яшчэ 50 гадоў.

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ БЕЛАРУСКАЯ

EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

polska pomoc

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap. The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.